**Вальдэмар Буткевіч**

# ***Як застацца старалітвінам у XXI стагоддзі?***









**Слупск 2025**

© Copyright by Вальдэмар Буткевіч Waldemar Butkiewicz

***Беларусу,***

*які спачатку прачытае аб трагічным лёсе старалітвінаў,*

*а пасля навечна вырачацца сваёй беларускасці,*

*з глыбокім спачуваннем*

*да цяжару няшчаснага чалавека*

*сваё сціплае эссэ прысвячаю*

*і яму сваю творчасць*

*ахвярую.*

**Аўтар.**

***Nikt nas teraz nie obwini,***
***Nikt na świecie nie zapyta:***
***Czy jeszcze żyją Litwini?***
***Oto Pogoń nasza świta!***

**Juliusz Słowacki.**

Вось і праляцела першая чвэрць XXI стагоддзя. Чым далей ідзе час, тым далей прыходзіць трагічнае ўсведамленне: *“Сканалі рэшткі майго народу…”*. Здавалася, народу бессмяротнага. Народу, які праз столькі стагоддзяў крывавай, збройнай і духоўнай барацьбы не магчыма было сцерці з твару зямлі, аддаць забыццю. Народу знатнага, высока-культурнага, захоўваючага ў сваіх сэрцах векавыя традыцыі і нязменныя ідэалы маёй абражанай і ўжо больш сотні гадоў як разарванай Айчыны.

Дазваляючы сабе выкласці на паперы ўласную душэўную драму, прыгадваю шляхецкі народ даўняй Літоўскай манархіі. Мае шляхетныя літвіны, старалітвіны…

Апошняе азначэнне з’явілася на рубяжы XIX – XX стагоддзяў. Пад паняццем *“старалітвін”* разумелася асоба, пражываючая на абшарах былога Вялікага Княства Літоўскага, маючая шляхецкае альбо княжацкае паходжанне і ў жыцці, звычайна, не паслугоўваючаяся літоўскай мовай. Азначэнне згаданае

паўстала з мэтай размежаваць усё яшчэ захоўваючых традыцыю даўняй Літоўскай дзяржавы польска-культурных прадстаўнікоў прывілеяванага стану і балта-культурную інтэлігенцыю з паўночна-заходніх ускраін былога Вялікага Княства, дзеячаў літоўскага нацыянальнага руху – літоўскіх нацыяналістаў, да якіх часам ужывалі азначэнне *“младалітвіны”*.

Напрыклад, у ліпені 1906 году, у 146-м нумары Віленскай газеты *“Kurjer Litewski”*, з’явіўся артыкул асобы, падпісанай як *“Starolitwin”*. Аўтар, у тым ліку, сцвярджаў: *“…Старажытная шляхта літоўская, а не „зямяне польскія на Літве”, жыве і ніколі не расстанецца з выцвілым у яе руцэ штандарам з Пагоняй, але выглядае яна сёння як пазбаўленае вятрамі і бурамі галінаў старае дрэва… Утварыліся ўжо дзве партыі. Адна складаецца са літоўскай шляхты, кроў якой ёсць літоўская, польская і руская (не расійская), якой думка, мова, звычай і хатняе выхаванне ёсць польскія. За часамі Рэчы Паспалітай шляхецкай стварала яна „літоўскі народ”, значыць, назвай найпрыдатнейшай для той партыі будзе „Старалітоўская”. Месцам яе пражывання ёсць усё даўняе Вялікае Княства Літоўскае. Другой партыі назва „Младалітоўская”, складаецца яна з новапаўсталай інтэлігенцыі, у большасці з літоўскай псеўдаінтэлігенцыі, бяручайся з запалам да навукі і перадусім да вядзення і кіраўніцтва непадзельнага*

*народу... Младалітвіны насяляюць Літву этнаграфічную і Вільню, якую лічаць сваёй. Наколькі народзіны і першыя немаўлячыя крокі нацыянальна-літоўскага руху мы віталі з сардэчным, братнім пачуццем сямейнага шчасця, настолькі пастаяннае адасабленне, несправядлівыя супраць нас напасці, а, урэшце, змовы супраць нас пад час выбараў з жыдамі, не маглі не астудзіць у нас пачуцця братэрскай сувязі... Я сам паходжу з малапольскай сям'і, аднак, тры стагоддзі, страчаныя маімі продкамі на Літве, даюць мне хіба права называння сябе літвінам... Калі ж мы пачуем асуджаючыя шавінізм галасы, застаючыся ў такой супрацьлегласці да даўняга праўдзівага старалітоўскага патрыятызму?".*

Магчыма цалкам пагадзіцца з аўтарам, што ў даўнія часы пераважна шляхецкія асяродкі з'яўляліся захавальнікамі народнай свядомасці і самаакрэслення, а ў слаўныя часы існавання польска-літоўскай Рэчы Паспалітай большасць адукаваных прадстаўнікоў упрывілеяванага стану *"Вялікага Княства Літоўскага, Рускага, Жамойцкага і іншых"*, сапраўды, паступова зліліся ў адзіны шляхецкі народ. З адзінай канфесіяй, самасвядомасцю, адзінай высокай культурай. Да другой паловы XVIII стагоддзя большасць адукаванай шляхты Літоўскай дзяржавы ўжо была каталікамі, належала да лацінскай цывілізацыі, у публічным, а, часта, і ў прыватным жыцці паслугоўвалася польскай мовай і

з'яўлялася носьбітамі старой літоўскай традыцыі, захоўваючы ўсе яе сэнсы і сімвалы разам з патрыятызмам да ўласнай Айчыны. Да таго ж меўшы падвойную польска-літоўскую самасвядомасць, адчуваючы сябе літвінамі, як грамадзянамі Літвы, Вялікага Княства Літоўскага, і палякамі, як грамадзянамі Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў, ад XVII стагоддзя часта скарочана іменуемай *"Польшчай"*.

Традыцыя старой Літвы не пераставала жыць у чалавечых розумах і пасля падзелаў Рэчы Паспалітай з аднвачасовым знішчэннем Вялікага Княства Літоўскага і далучэннем яго абшараў да Расійскай Імперыі ў якасці непасрэднай яе часткі.

Аднак, ужо XIX стагоддзе прынесла першы смяротны ўдар па розумах знаці. На жаль, далёка не ўсе выхадцы з адукаванай літоўскай шляхты пасля смерці іх Айчыны апынаіся ідэйнымі нашчадкамі ўласных продкаў. Разам з тым менавіта ў згаданай эпосе залягаюць карані ўзнікнавення і пашырэння на землях былога Вялікага Княства Літоўскага ўзору 1772 году ідэалогій польскага і младалітоўскага этна-культурных нацыяналізмаў, а да таго ж і імперскага заходнерусізму, пераемнікам значнай колькасці ключавых ідэй якога стане зарадзіўшыся ў другой палове XIX стагоддзя нацыяналізм беларускі. Усе адзначаныя з'явы паступова пачыналі запаланяць розумы адукаваных жыхароў былога Вялікага Княства Літоўскага,

літаральна разрываць на кавалкі яго з цяжкасцю застаючыеся адзінымі землі.




***Польска-літоўская Рэч Паспалітая. Да падзелаў. Карта XVIII стагоддзя.***

Свайго піку выбух нацыяналізмаў у Краі дасягнуў у пачатку XX стагоддзя. Абсалютная большасць захаваўшыхся шляхетных ліцвінаў з некалі традыцыйнай, грамадзянскай польска-літоўскай самасвядомасцю апынулася пад вялізным уплывам

далей і далей распаўсюджваўшайся нацыяналістычнай чумы, што, у тым ліку, стала адной з прычынаў паразы ідэі адраджэння Вялікага Княства Літоўскага як шматмоўнай і шматкультурнай дзяржавы.

Значная частка застаўшыхся старалітвінаў, калі раней сябе падобным чынам і адчувала, у выніку, сярэдзіну XX стагоддзя сустрэла ўжо будучы носьбітамі чыста польскай нацыянальнай тоеснасці. Яшчэ частка – младалітоўскай і беларускай.

Вельмі паказальным прыкладам можа паслужыць гісторыя родных братоў: Ежы, Вацлава і Тадэвуша Іваноўскіх, айцец якіх, Леанард Іваноўскі, паходзіў з родавага маёнтку Лябёдка (на Гарадзеншчыне). Тадэвуш Іваноўскі ва ўласных успамінах адзначаў, што айцец сямейства яшчэ лічыў сябе літвінам у гістарычным сэнсе. Пад уплывам цёткі хлопчыкам з дзяцінства прывіваўся культ даўніх Літвы і Польшчы праз азнаямленне з творчасцю Адама Міцкевіча і Уладыслава Сыракомлі.

Але лёс распарадзіўся так, што Ежы Іваноўскі большую частку свядомага жыцця схіляўся да чыстай, этна-культурнай, нацыянальнай польскасці. Тадэвуш Іваноўскі абраў стаць балтамоўным літвінам, пераўтварыўшыся ў *“Тадаса Іванаўскаса”*. Ну а Вацлава Іваноўскага запомнілі перадусім як беларускага палітычнага дзеяча.

Вось так і выміраў мой народ, усё далей і далей зацягваемы ў нацыяналістычную бездань…

Аднак, і ў час татальнай перамогі эпохі нацыяналізмаў заставаліся адзінкі, якія ўласную традыцыйную старалітоўскасць праносілі амаль праз усё жыццё. Хоць, як бы тое не было сумна, нават і многія з іх, прынамсі, ужо ад 1920-х гадоў апынуліся падзеленымі паміж рознымі палітычнымі перакананнямі, амаль цалкам змірыўшыся з паразай ідэі адраджэння Вялікага Княства Літоўскага.

Дзеля таго, каб усвядоміць пастаянны працяг і трываласць традыцыі нават у самых неспрыяльных для яе выжывання ўмовах, а разам з тым абгрунтаваць натуральную пераемнасць для нас, сучасных, на жаль, адзінкавых яе носьбітаў, апошніх старалітвінаў, нарадзіўшыхся яўна не ў свой час, дастаткова прыгадаць усяго некалькі выбітных шляхетных літвінаў XX стагоддзя. На вокладцы прапаноўваемага чытачу эссэ як раз змешчаны прыклады такіх асобаў, амаль кожная з якіх мела выразную, у вельмі малой ступені траўмаваную вузка-этнічнымі нацыяналізмамі, польска-літоўскую самасвядомасць. І ўсё тое пераважна ў часы, калі з’ява, якую яны лічылі Айчынай, ляжала складзенай у труну, як і любыя надзеі на яе ажыўленне.



***Tadas Ivanauskas   Jerzy Iwanowski   Вацлаў Іваноўскі***









**Баляслаў Ялавецкі (1846-1918) –** ураджэнец Віленшчыны, прамысловец, краёвец, генерал інжынерных войскаў, дэпутат Расійскай Дзяржаўнай думы I склікання, дзе адстойваў ідэю аўтаноміі земляў былога Вялікага Княства Літоўскага. У 1905 годзе зрабіў у Вільні выданне невялічкай працы *“Litwa – jej potrzeby... Katechizm narodowy Litwy”*, у якім, з папраўкай на наступіўшую эпоху нацыяналізмаў, даводзіў: *“Пытанне. – Што такое Літва? Адказ. – Літва тое край, які спрадвечна насяляюць літвіны, палякі і беларусы, а таксама латышы ў Інфлянтах, злучаныя памиж сабой агульнасцю крыві і ўтвараючымі адзіны літоўскі народ. Пытанне. – Які абшар займае Літва? Адказ. - Цяпер Літва займае шэсць губерніяў..., а менавіта: Віленская, Ковенская, Гарадзенская, Менская, Магілёўская і Віцебская...”.*

Даследчыкі лічаць, што ў тым жа годзе, у Пецярбурзе, менавіта Баляслаў Ялавецкі пад псеўданімам *“Sargas”* выдаў яшчэ адну невялічкую працу – *“Litwo, Ojczyzna nasza…”*, дзе сцвярджаў: *“…Жыхар з-пад Палангі, Коўна, Вількаміра, Свянцян альбо Вільні, Гародні, Наваградка і нават з-пад Менска ёсць заўсёды літвінам, незалежна ад таго, ці ён размаўляе па-літоўску, па-польску альбо беларуску; увесь уклад яго жыцця, яго звычаі і ўвесь змест яго існавання ёсць такі падобны паўсюль, што акрамя мовы цяжка заўважыць нейкай большай розніцы; а тое даводзіць, што на ўсім абшары Літвы пражывае адзін народ…”.*



**Тадэвуш Урублеўскі (1858-1925)** – ўраджэнец Вільні, правазнаўца, адвакат, краёвец і айцец Віленскай бібліятэкі імя Урублеўскіх.

У год смерці згаданай асобы ў газеце *“Kurjer Wileński”* з’явіўся артыкул, аўтар якога аб знаёмстве з панам Урублеўскім адзначаў: *“...павітаў Ён мяне словамі: „Знаёміцца Пан з адным з апошніх магіканаў. Сёння ўжо засталося толькі трое праўдзівых грамадзянаў В. Княства Літоўскага і толькі трое праўдзівых краёўцаў. Я адзін з іх”... наша легенда была для яго рэальнай гістарычнай рэчаіснасцю... Яго месца было ў В. Кн. Літоўскім у XV альбо ў XVI стагоддзі, калі то паны літоўскія не хацелі поўнага зрывання сувязяў з каронай, але адначасова востра супрацьпастаўляліся ўсякім прагным тэндэнцыям з боку... апошняй... Урублеўскі... любіў перад усім наш край, з усімі яго жыхарамі без розніцы ўжыванай мовы, з усім яго багатым мінулым ад слаўных выправаў Вітаўта аж да баёў Каліноўскага ў гарадзенскіх лясах... у сённяшняй нацыяналістычнай Польшчы Урублеўскі не мог для сябе знайсці месца. Сённяшняй Польшчы Урублеўскі не мог зразумець... Нацыяналістаў Урублеўскі лічыў сваімі праціўнікамі. Быў то для яго чужы і варожы лагер...”.*



**Канстанцыя Скірмунт (1851-1934) –** публіцыст, пісьменніца, гісторык-аматар старажытнай Літвы, прадстаўніца краёвага руху, ураджэнка Піншчыны, без малага ўсё жыццё прысвяціўшая залагоджванню ўзаемных спрэчак паміж балтамоўнай інтэлігенцыяй і спольшчанай літоўскай шляхтай.

Канстанцыя Скірмунт даводзіла: *“…Належу да літоўскай стыхіі, жывучай і дзейнічаючай без перапынку, не толькі ў народзе, але і сярод шляхты, на зямлі Вітаўтаў і Гедымінаў. Gente Lithuana, nacione Lithuana…”*, адначасова падкрэсліваючы, што яе народнае самавызначэнне не азначае разрываў усіх гістарычных сувязяў, паколькі яна належыць да тых літвінаў, якія сувязь з Польшай лічаць за святасць і за волю Бога. *“…Народная адметнасць, пры еднасці ў палітыцы, развіццё ўласнай індывідуальнасці пры*

*братнім, непадзельным саюзе, бітва з шавінізмам і польскім, і літоўскім, на правіле здаровага народнага патрыятызму і вялікіх хрысціянскіх пачуццяў – тое правілы, якія вызнаю і якія – веру – стануць правіламі ўсёй браціі маёй літоўскай, калі адпусціць іх гарачка шавінізму…”*; *“…Мы браты, літвіны ўсе, ці размаўляем па-літоўску ці па-польску…”*.

Імкнулася давесці балтамоўнаму літоўскаму нацыяналісту, Йонасу Басанавічусу, перакананне, што на абшарах даўняга Вялікага Княства Літоўскага ў іх час існуюць, прынамсі, дзве формы літоўскасці – этнічны і гістарычны. І місіяй іх пакалення з’яўляецца прымірэнне вышэй адзначаных формаў. Залатым мастом паміж балтамоўнымі і славянамоўнымі літвінамі Канстанцыя Скірмунт лічыла Адама Міцкевіча.



**Мар'ян Здзяхоўскі (1861-1938)** – ураджэнец Меншчыны, гісторык, філосаф, філолаг, літаратурны крытык, публіцыст, прафесар і рэктар Віленскага ўніверсітэту.

У 1923 годзе перад публікай Мар'ян Здзяхоўскі сцвердзіў: *"...край наш з'яўляецца часткай гістарынчай Літвы – і нас – людзей майго пакалення – выхоўвалі, як літвінаў, відавочна ў тым значэнні, у якім ім быў Міцкевіч, калі ўсклікаў: „Літва, мая Айчына". У дзяцінстве мяне вучылі, разам з гісторыяй Польшчы, так жа гісторыі Літвы; дзякуючы таму за народных герояў я лічыў не толькі тых, што Польшчу будавалі, але і таго, які меў намер Літву ад Польшчы адарваць – В. Кн. Вітаўта... І калі б мяне сёння запыталі, кім я сябе адчуваю ў глыбіні сэрца, сказаў бы, што адчуваю сябе грамадзянінам В. Кн. Літоўскага, неразарвальна Уніяй злучанага з Польшчай. Калі бачу развіваючыся... з Замкавай Гары штандар з арлом, а без пагоні, адчуваю тое, як учыненую сабе крыўду. Такім ёсць толькі голас сэрца. Кожны... з нас ведае і разумее, што канцэпцыя літоўскай дзяржавы ў уніі з Польшчай сёння ёсць нерэальнай... Дык, значыць, слушнасць была на баку нацыяналістычнай канцэпцыі, уключаючай тыя землі да Польшчы і пазбаўляючай і асобнага характару? Таксама не..."*.



**Князь Яўстах Севярын Сапега (1916-2004) –** ураджэнец Гарадзеншчыны, кавалерыст Войска Польскага, прафесійны паляўнічы, на працягу значнай часткі жыцця ствараўшы ўласнае гістарычнае даследванне роду Сапегаў.

Вярнуўшыся на родные землі Нёмана ў 1999 годзе, адказваючы на пытанне ў інтэрв'ю адносна ўласнай тоеснасці, князь сцвердзіў: *"…Усе мы, Сапегі, і я ў тым ліку, былі грамадзянамі Вялікага Княства Літоўскага, што ўваходзіла ў склад Рэчы Паспалітай. І я адчуваю сябе грамадзянінам Рэчы Паспалітай, але, бясспрэчна, паходжаннем з Вялікага Княства Літоўскага. Цяпер тут Літва, Беларусь, Украіна… Мы ж былі грамадзянамі Вялікага Княства Літоўскага…"*.



**Чэслаў Мілаш (1911-2004)** – ураджэнец Кейданшчыны, гісторык літаратуры, паэт, пісьменнік, лаўрэат Нобелеўскай Прэміі. Уласна сябе Чэслаў Мілаш прызнаваў за прадстаўніка апошняга пакалення, якое яшчэ сутыкнулася з папулярным у XIX стагоддзі паняццем *“gente Lithuanus, nacione Polonus”*.

Калі ў паэта запытвалі аб яго народнай тоеснасці, у адказ маглі пачуць: *“...Я вельмі жадана лічу сябе грамадзянінам Вялікага Княства Літоўскага...”*; *“...Адчуваю сябе палякам таму, што мая сям’я размаўляла па-польску ад XVI стагоддзя – тое раз; па-другое, выхаваўся ў культуры польскай, на літаратуры польскай. Можа я не вельмі артадаксальны паляк...”*; *“...Я асабіста лічу сябе за чалавека Вялікага Княства Літоўскага: жадана бы сябе так акрэсліваў, так як мой прафесар Сукеніцкі, які лічыў сябе размаўляючым па-*

*польску літвінам. Цяжка тое сёння зрабіць, бо тыя паняцці ўласна не існуюць…”*.

У 2003 годзе, незадоўга да смерці Чэслава Мілаша і князя Севярына Сапегі, у каталіцкай сям’і горада Ліды са шляхецкімі каранямі, прасочанымі да XVII стагоддзя, і паловай продкаў, у XX стагоддзі запісаўшыхся *“палякамі”*, нарадзіўся аўтар прадстаўленых разважанняў – *“паляк па дакументах, літвін па душы”*, валодаючы польскай, захапляючыся геніяльнай творчасцю Адама Мікевіча, пішучы да свайго чытача на дзвух мовах, цяпер жывучых на яго роднай Лідчыне, усе свае сілы і старанні ахвяруючы яго ж неіснуючай Літве, аднак, на жаль, пакуль не ведаючы мовы сваіх далёкіх язычніцкіх продкаў з берагоў Нёмана і Віліі.

Да маёй сям’і, на шчасце, яшчэ даляцелі ўрывачкі старой літоўскай традыцыі. Адноснае пачуццё польскасці, шляхецкі гонар, памяць пра адрознае ад іншых паходжанне. Чуўшы аб тым з дзяцінства, пражыўшы большую частку жыцця на сучасным літоўска-беларускім памежжы, толькі несумленны чалавек не звернецца да гістарычнай навукі за пошукам адказаў на пытанні: *“Чыя мы шляхта? Чаму “палякі”? Адкуль мы?”*. І, у поўнай меры адрадзіўшы ўнутры сям’і ўжо забываўшуюся традыцыйнасць, адказ атрымае наступны – *“Са спрадвечнай Літвы”*.

Аўтар дадзеных радкоў, абшары нараджэння абсалютнай большасці бліжэйшых продкаў якога

знаходзяцца на шляху ад Ашмяншчыны да Лідчыны і Дзятлаўшчыны (землі, у даўнія часы пераважна балта-культурныя і язычніцкія), акрэсліваючы ўласную тоеснасць, можа болей чым праз сотню гадоў з упэўненасцю паўтарыць за Канстанцыяй Скірмунт – *“gente Lithuanus, nacione Lithuanus”* – родам літвін, народам літвін. З адзінай папраўкай – старалітвін.

Якім жа чынам магчыма адказаць на пытанне, змешчанае на вокладцы прапаноўваемага чытачу эссэ?

## *Як застацца старалітвінам у XXI стагоддзі?*

**I.** Першае і самае істотнае – прыбраць з розуму любы этна-культурны нацыяналізм, як і атаясамліваенне сябе з любым з сучасных народаў, іх уяўленнямі аб гісторыі, стэрэатыпамі, псіхалогіяй, спосабам мыслення. Сучасныя балтамоўныя літвіны (*“літоўцы”*), беларусы і палякі ў пэўным сэнсе ўсё яшчэ застаюцца нашымі пабрацімамі, прынамсі, паколькі ў іх шэрагах надалей жывуць нашчадкі нашага адыйшоўшага народу, хоць таго і не ўсведамляюць. Але, на вялікі жаль, яны – не мы. Тое пераканаўча давяла перамога іх нацыяналізмаў у мінулым стагоддзі, спрычыніўшаяся да нашага ментальнага вымірання.

**II.** Нягледзячы на прапісаныя ў дакументах *“нацыянальнасці літоўцаў і беларусаў”*, заўсёды

публічна ад іх адмаўляцца і падкрэсліваць сваю старалітоўскасць. У выпадку выхадцаў з сучасных Літвы і Беларусі, продкі якіх запісаны *“палякамі”*, намінальная польскасць і сантымент да польскай культуры могуць застацца як часткі традыцыі. Аднак, *“польскасць”*, перадусім, як абвяшчэнне грамадзянства былой Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў (старой Польшчы) з такім жа падкрэсліваннем старалітоўскасці уласнай асобы.

**III.** Ні сучасныя Літва, ні Беларусь, на вялікі жаль, не могуць успрымацца ў якасці Радзімы. Не можа існаваць іншай Айчыны, акрамя Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў.

**IV.** У большасці нават шляхецкіх сем’яў былога Вялікага Княства Літоўскага традыцыя на цяперашні момант страчана і забыта. Альбо засталіся яе невялічкія адгалоскі. Як яе адбудаваць унутры сябе? – Праз знаёмства са спосабам мыслення старалітвінаў, у чым сур’ёзней за ўсё дапаможа літаратура, гісторыя, музыка і выяўленчае мастацтва, з’явіўшыеся іх стараннямі ў XIX-XX стагоддзях. Размова пра стварэнні Вінцэнта Дмахоўскага, Яна Чачота, Валенція Ваньковіча, Адама Міцкевіча, Уладыслава Сыракомлі, Тэадора Нарбута, Юзафа Крашэўскага, Ігнацыя Ходзькі, Аляксандра Ходзькі, Станіслава Манюшкі, Казіміра Альхімовіча,

Элізы Ажэшкі, Мечыслава Карловіча, Канстанцыі Скірмунт, Юзафа Мацкевіча, Севярына Сапегі, Чэслава Мілаша ды многіх-многіх іншых. Дапаможнай можа быць літаратура і выяўленчае мастацтва, створаныя выхадцамі з былой Кароны Польскай і закранаючыя гісторыю Літвы, напрыклад, творы Юліюша Славацкага, Генрыха Жавускага, Яна Матэйкі, Генрыха Сенкевіча, Яна Стыкі. Польская культура, асабліва паўставаўшая трудом шляхетных літвінаў, у цяперашнім свеце з'яўляецца адзіным сапраўдным мастом да страчанай нашымі папярэднікамі Літвы, нашай Літвы.

**V.** Такім жа шляхам складанай перабудовы ўласнай свядомасці і спосабу мыслення далучацца да адзначанай старалітоўскай традыцыі ў яе чыстым, незабруджаным познімі напластаваннямі, выглядзе можа любы выхадзец з зямель сучасных Літвы і Беларусі, нягледзячы на сацыяльнае паходжанне.

Часам, усё больш і больш сутыкаючыся з людскім неразуменнем на сваім шляху, маючы ўсяго адзінкавых знаёмых з падобным светапоглядам, з гараччу прыходзіць адчуванне, што мы апошнія старалітвіны ў свеце. І раптам узгадваецца думка са знакамітага галівудскага фільма: *"Ведаеш, у чым небяспека быць*

*апошнім з кагосьці? У хуткім часе не застанецца нікога…”.*

Здавалася б, сёння ў Еўропе існуе цэлы народ пад літоўскім найменнем – балтамоўныя літвіны, якіх чамусьці прынята называць маскоўскай мянушкай, *“літоўцамі”*. Быццам бы чалавек маіх поглядаў павінен адчуваць да іх блізкасць, як, напрыклад, адчувала Канстанцыя Скірмунт… Але як магчыма адчуваць блізкасць да людзей, значнейшая колькасць з якіх сёння вызначае сябе ў свеце згодна з прымітыўнымі нацыяналістычнымі крытэрыямі? Як магчыма адчуваць блізкасць да людзей, у асноўнай масе з’яўляючыхся ідэйнымі пераемнікамі балтамоўнай младалітоўскай інтэлігенцыі XIX – XX стагоддзяў, у вялікай ступені сваімі дзеяннямі і шавінізмам прывёўшай да смерці ідэі адраджэння Вялікага Княства Літоўскага?

З іншага боку, існуе ў нашай рэчаіснасці дастатковая колькасць славянамоўных жыхароў даўняй Літоўскай дзяржавы, заяўляючых аб тым, што яны *“літвіны”*. Аднак, і ў дадзеным выпадку я знаходжу толькі малюсенькую колькасць людзей, якія б нас, сапраўды, разумелі. Часцей за ўсё згаданыя асобы з’яўляюцца звычайнымі носьбітамі беларускага нацыяналізму, спрабуючымі нацягнуць на сябе літоўскае найменне, не змяняючы сутнасці ўласнага мыслення. Дзе-нідзе могуць сустрэцца, і праўда, неверагодна адукаваныя і высокакультурныя людзі

сярод вышэй адзначаных славянамоўных літвінаў сучаснай Беларусі, аднак, іх перакананні і дзеянні, на мой погляд, паўтараюць памылкі балтамоўных літвінаў – вырыванне кавалка з неабдымнай традыцыі, яго культываванне, адкідванне ўсяго, што не выглядае прывабна, і стварэнне з саміх сябе чарговага нетрадыцыйнага новабуду. Урэшце, знаходзяцца і выхадцы з Віленска-Гарадзенска-Віцебскіх *“палякаў”*, усё больш і больш схіляючыеся да старалітоўскасці, але не здольныя на цяперашні момант канчаткова ўсталяваць і выкрышталізаваць уласныя погляды.

Магчыма, мае словы адгукнуцца ў якім-небудзь сэрцы, і хоць калі-небудзь мы перастанем адчуваць сябе “апошнімі з магіканаў”. Можа дзесьці і бродзяць па свеце нашы ідэйныя пабрацімы. Дай Бог, каб сустрэліся.

Ну а цяпер, пакуль зямля Касцюшкі і Міцкевіча згарае ад сораму пад цяжарам младалітоўскага і беларускага нацыяналізмаў, беларускага заходнерусізму і нявыкараненай савецкасці, працягваю жыць і пісаць.

Усё для яе – маей… Літвы…

*Consumor aliis inserviendo*